ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі
і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.

№ 7 Аўторак, 3 Кастрычіка 1944 г.

**ПА БОЛЬШЭВІЦКІ ПРАВЯДЗЕМ ФРАНТАВУЮ ДЭКАДУ ПА ЗАКАНЧЭННЮ ХЛЕБАПАСТАВАК ДЗЯРЖАВЕ!**

## Кожны кілаграм здадзенага дзяржаве хлеба—куля у сэрца нямецкім захопнікам!

## ТЭРМІНОВА ЗАКОНЧЫЦЬ ПАСТАЎКУ ХЛЕБА ДЗЯРЖАВЕ

Перад совецкім сялянствам стаяць вялікія дзяржаўнай важнасці задачы—поўнасцю ліквідаваць вынікі нямецкай акупацыі ў галіне сельскай гаспадаркі, усімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі ў паспяховым заканчэнні поўнага разгрома фашысцкай Германіі.

Зараз, як ніколі, усе сілы народа павінны быць накіраваны на дапамогу фронту. Чырвоная Армія, падтрыманая працоўнымі подвігамі гераічнага совецкага тыла, бязлітасна знішчае ворага, нясе яму немінуемую гібель у яго ўласнай бярлозе.

Натхнёныя бліскучымі перамогамі Чырвонай Арміі, працоўныя нашага раёна значна ўзмацнілі дапамогу фронту. Многа хлеба, бульбы, мяса, гародніны здалі сяляне ў Фонд абароны краіны.

З вялікай радасцю прыступілі сяляне да выканання дзяржаўных абавязацельстваў на хлебапастаўках, адчуваючы, што гэта іх важнейшы і першачарговы абавязак перад радзімай. Большая часць сялян ужо поўнасцю разлічылася з дзяржавай па хлебапастаўках і прыступіла да выканання абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве. У Альбінскім, Грыўдзенскім сельсоветах і ў пасялковым Совеце Івацэвічы план выканання збожжапаставак падыходзіць да заканчэння.

Аднак мы маем рад сельсоветаў і сялянскіх гаспадарак дзе выкананне плана хлебапаставак ідзе марудным тэмпам. У Любішчыцкім, Бусяжскім, Стайкаўскім сельсоветах да гэтага часу не ўлічана поўнасцю пахатная зямля і хлеб з гэтых сельсоветаў паступае яўна нездавальняюча.

Абком КП(б)Беларусі і Выканкомам Облсовета дэпутатаў працоўных аб'явілі з 1 па 10 кастрычніка франтавую дэкаду па заканчэнню выканання плана дзяржаўных паставак хлеба ва ўсіх раёнах вобласці.

Перад партыйнымі, совецкімі і комсамольскімі арганізацыямі, а таксама перад усімі работнікамі сельсоветаў і сялянамі пастаўлена баявая задача: поўнасцю выканаць план хлебапаставак дзяржаве і ў самы кароткі тэрмін.

„Хлеб—фронту!" Пад такім лозунгам мы павінны закончыць выкананне дзяржаўных абавязацельстваў па здачы хлеба. Мы павінны даць хлеб Чырвонай Арміі імена тут, у бліжэйшых да фронта раёнах, каб не загружаць нашы чыгункі перавозам хлеба з тылавых абласцей СССР.

Разам з заканчэннем паставак хлеба мы павінны разгарнуць масавую здачу бульбы і другіх прадуктаў.

Азнамянуем франтавую дэкаду масавымі Чырвонымі абозамі з хлебам, бульбай і другімі прадуктамі! Поўнасцю выканаем свой важнейшы абавязак перад Радзімай —дадзім краіне і фронту дастатковую колькасць сельскагаспадарчых прадуктаў!

## ХЛЕБ—ФРОНТУ

### Чырвоны абоз

Першы дзень франтавога дэкадніка па заканчэнню выканання хлебапаставак сяляне Альбінскага сельсовета азнаменавалі масавай здачай хлеба і бульбы дзяржаве.

Раніцай у Косаў прыбыў Чырвоны абоз. 45 фурманак нагружаных хлебам і бульбай выстраіліся перад прыёмным пунктам. На перадзе абоза з чырвоным сцягам лепшыя комсамолкі сельсовета Піваварчык Алена, Ганчар Люба, Кукса Надзя, Пархута Александра.

Сяляне Альбінскага сельсовета ўсе сілы прыкладаюць, каб як хутчэй разлічыцца з дзяржавай па ўсіх відах паставак. Большая частка сялян ужо выканала і перавыканала план збожжапаставак і прыступілі да здачы бульбы.

### Браць прыклад з перадавых хлебаздатчыкаў

Першым у в. Быч Стайкаўскага сельсовета выканаў хлебапастаўкі 72-х гадовы стары Раўбэнкі Александр. Яго прыкладу паследаваў Каспяровіч Грыгорый Захаравіч і Трацяк Іван Карпавіч. Якія поўнасцю выканалі хлебапастаўкі.

Дзякуючы прыкладу перадавых сялян вёска Быч падыходзіць да заканчэння хлебапаставак.

Усім сялянам сельсовета трэба раўняцца па перадавых хлебаздатчыках.

Здановіч.

СЯЛЯНЕ І СЯЛЯНКІ! ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАННЕМ ХЛЕБАПАСТАВАК НАБЛІЗІМ ЧАС РАЗГРОМА НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ!

## Выканалі хлебапастаукі

75-гадовы Джэгайла Фама (в. Юрашкі) поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па здачы збожжа. Акрамя гэтага 50 кг. хлеба ён здаў у фонд Чырвонай Арміі. Чэсна выканала свой абавязак перад дзяржавай Дакучыч Елізавета Міхайлаўна (в. Ятвезь). Яна поўнасцю выканала план хлебаздачы.

Прыклад лепшых сялян сельсовета павінны падхапіць усе сяляне і па франтавому закончыць хлебапастаўкі дзяржаве.

## Нарада раённага партыйна-совецкага актыва

1 Кастрычніка ў гарадскім клубе адбылася нарада раённага партыйна-совецкага актыва, прысвечаная правядзенню франтавога дэкадніка па заканчэнню здачы хлеба дзяржаве.

На нарадзе прысутнічалі ўсе старшыні і сакратары сельсоветаў, кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый.

З дакладам аб задачах франтавога дэкадніка выступіў старшыня Выканкома райсовета дэпутатаў працоўных т. Манахаў.

—Мы павінны выканаць план паставак хлеба ў самы сціслы тэрмін,—гаворыць т. Манахаў—гэтага ад нас патрабуюць інтарэсы Радзімы, фронта, інтарэсы перамогі над ворагам.

З вялікай прамовай па нарадзе выступіў нам. Старшыні СНК БССР т. Валошын, які паставіў перад актывам рад канкрэтных задач

## НА БЫТАВЫЯ ТЭМЫ

## КАЛІ У КОСАВЕ БУДЗЕ БАНЯ?

Кожнаму зразумела якое значэнне мае баня для чалавека. Мне здаецца, што гэта добра разумее і старшыня Горсовета т. Трында і загадчык комунальнага адзела т. Бабенка.

Усе разумеюць... А бані ў горадзе так і няма, памыцца так і няма дзе.

У Горсовеце ўсё ссылаюцца на недахоп рабочай сілы. Усё спадзяюцца, што нехта дасць гэтую рабочую сілу і... нават пабудуе баню. Як-бы гэта было добра. Тады-б і работнікам Горсовета можна было-б памыцца, ды і клопату менш.

Аб гэтым можна доўга гутарыць і меркаваць. Гэта нікому не дасць карысці. Мы павінны паставіць пытанне ясна: Калі-ж у горадзе будзе баня?

Адказ на гэта пытанне чакаем ад т. т. Трында і Бабенка.

АЛЕСЬ КАЛІНА.

## Арганізаваць мастацкую самадзейнасць

Сумна ў нас у Косаве. Гэта адчувае кожны. Асабліва гэта адчуваецца ў выхадныя дні. Вечарамі, пасля працы, рабочыя і служачыя не знаходзяць месца, дзе-б можна было культурна і весела правесці час.

А між іншым, мы маем усе магчымасці арганізаваць культурны адпачынак для працоўных горада. У нас ёсць нядрэнны клуб. Але ён пакуль служыць месцам для танцаў. Ды і танцы бываюць адзін раз у месяц. Гэты клуб трэба неадкладна зрабіць месцам дзе можна было-б весела правесці вольны час. У нас ёсць нядрэнныя скрыпачы, гарманісты, цымбалісты, з якіх можна арганізаваць музыкальны гурток. У нас ёсць многа дзяўчат, якія гарацъ жаданнем удзельнічаць у харавым гуртку. Нарэшце, мы можам арганізаваць і драматычны гурток.

Трэба толькі некаму ўзначаліць гэту справу. Нам здаецца, што за гэта павінен узяцца Райком комсамола. Моладзь ахвотна падтрымае гэта мерапрыемства.

Мастацкая самадзейнасць пры правільнай яе арганізацыі і накіраванасці служыць не дрэннай формай прапаганды і агітацыі. Такую самадзейнасць мы павінны неадкладна арганізаваць у горадзе.

## ПІСЬМО З ФРОНТА

### Комсамольцам і моладзі Косаўскага раёна

Дарагія таварышы!

Мы, комсамольцы-франтавікі шлём вам свае баявое чырвонаармейскае прывітанне і жадаем яшчэ лепш працаваць на карысць нашай слаўнай Радзімы. Мы заклікаем вас не пакладаючы рук дапамагаць фронту ўсім неабходным. Пры вашай дапамозе воіны Чырвонай Арміі хутчэй разаб'юць ненавіснага ворага.

Мы, комсамольцы-франтавікі, будзем біць ворага яшчэ мацней, каб пасля нашых сакрушальных удараў фашысцкі звер ужо ніколі не змог-бы апрамяцца. Мы ніколі не забудзем і ні прасцім фашысцкім палачам таго вялікага гора, якое перанеслі нашы бацькі, браты, сёстры і дзеці за час крывавай нямецкай акупацыі.

Смерць і помста нямецка-фашысцкім ізвергам!

Няхай жыве наша вялікая Совецкая Радзіма!

Комсамольцы франтавікі
Бурвін (комсорг батальёна), Галавін, Саломін Клеймякоў.

## Маслабойны цэх

Пры Косаўскім паравым млыне абарудаван цэх па вырабу масла з ільнасемя і канапель. У бліжэйшыя дні цэх будзе пушчан у эксплаатацыю.

## КІНОАПАРАТУРА—АБЛАСЦЯМ БЕЛАРУСІ

Камітэт па справах кінофікацыі пры СНК БССР нядаўна атрымаў для кінотэатраў рэспублікі партыю стацыянарных кіноўстановак і кінопрасовак.

20 стацыянарных установак адпраўлены ўжо ў гарады і абласныя цэнтры рэспублікі. 3 стацыянарных кіноапараты атрымаў горад Брэст, па два апараты—гарады Пінск, Барысаў, Бабруйск.

У раённыя цэнтры і калгасы рэспублікі накіраваны таксама 33 гукавых кінопрасоўкі.

Да канца бягучага года ў розныя абласці Беларусі будзе накіравана яшчэ 75 кінопрасовак.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага, 106.

В. а. Рэдактара А. П. РУДОЙ.